Студенческая наука и инновационное развитие : материалы 95-й Международной научно-практической конференции студентов и магистрантов "Студенты - науке и практике АПК", (Витебск, 20-21 мая 2010 г.) / Витебская государственная академия ветеринарной медицины. - Витебск : ВГАВМ, 2010.

УДК 008

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА – НАЦЫЯНАЛЬНЫ ДУХОЎНЫ СКАРБ

**МАЛЬПГА А.У.**, студэнтка
Навуковы кіраўнік **ЛАБЕРКА Н.Д.**, старшы выкладчык
УА « Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

Беларуская мова створана на аснове ўсходнееўрапейскай і заходнееўрапейскай цывілізацый. Яна паспяхова выконвала разнастайныя функцыі: была дзяржаўнай у Вялікім княстве Літоускім (на ёй напісаны Статуты ВКЛ 1529 г., 1566 г., 1588 г., беларускія летапісы, філасофскія трактаты і інш.). У неспрыяльныя гістарычныя перыяды беларуская мова захоўвалася пераважна сярод асноўнай часткі беларускага этнасу - сялянства, а ў перыяды адраджэння распаўсюджвалася і ў прафесійнай культуры. На сучасным этапе этнамоўныя працэсы працякаюць у новых умовах. З сярэдзіны 80-х гадоў XX ст. у рамках дэмакратызацыі грамадства ўзмацніўся рост нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, што выклікала да жыцця шэраг пытанняў, злучаных са статутам беларускай мовы ў рэспубліцы. Гэта прывяло да прыняцця ў 1990 годзе Закона аб мове, які прадугледжваў беларускую мову ў якасці дзяржаўнай, што было замацавана Канстытуцыяй 1994 года. У 1995 годзе на Рэферэндуме былі ўнесены папраўкі ў практыку ажыццяўлення Закона аб мове. Народ Рэспублікі Беларусь выказаўся за роўнае існаванне дзвюх моў - беларускай і рускай.

Для Рэспублікі Беларусь характэрна колькасная большасць карэннага этнасу, але ў рэспубліцы пражываюць таксама прадстаўнікі больш за 100 народаў.

Этнамоўныя працэсы ў горадзе і сельскай мясцовасці значна адрозніваюцца. На характар іх працякання велізарны ўплыў аказваюць асаблівасці этнічнага асяроддзя, моўныя традыцыі.

Новая тэндэнцыя ў сучасным жыцці Беларусі назіраецца з сярэдзіны 90-х гадоў. Вынікі рэферэндуму ўжо прывялі да змен у моўнай сферы. Паніжаецца прэстыж беларускай мовы як мовы выкладання і зносін. Шырокае распаўсюджанне руская мова атрымала яшчэ з часоў уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. У часы СССР, асабліва пасля Вялікай Айчыннай вайны, рускай мове ў нацыянальных рэспубліках надавалася велізарнае значэнне, што і абумовіла масавае развіццё беларуска-рускага двухмоўя. Але беларуская мова не знікла: шукала і знаходзіла розныя варыянты паміж нацыянальным утрыманнем і моўнай праявай. Мова з'яўляецца неацэнным багаццем народа, своеасаблівым скарбам нацыянальнай культуры.